Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЛІСТАПАДА 2017 г. АЎТОРАК №224 (28588)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Смак і забавы кірмашу

СТАР. 5



Гульні вакол трона

СТАР. 11



Хэлоўін ці Рэфармацыя?

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл РУСЫ, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Расійскія аграрыі сёння гавораць пра тое, што гатовы сваімі сіламі закрываць патрэбнасці ўнутранага рынку па некаторых пазіцыях па «малочцы», у прыватнасці па сыры. Беларусаў просяць вызваліць паліцы. Тым не менш мы лічым, што ўмовы будзе дыктаваць не адміністратар, а спажывец. Той расійскі рынак, які ў нас ужо адпрацаваны, мы пакідаць не збіраемся. З нашымі калегамі сёння ёсць стратэгічныя дамоўленасці, і мы гатовы працаваць на канкурэнтнай аснове. Калі ты сёння аднекуль пойдзеш, то заўтра цябе там чакаць ужо не будуць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.11.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0017 | ▼ |
| Еўра | 2,3547 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0337 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0755 | ▼ |

# Не чакалі?

Сенсацыя ў свеце беларускай фаўны — у Мінск прыляцела сава-«чырванакніжніца» — даўгахвостая кугакаўка.



Фота Анатоля КЛЯШЧУКА.



Як-ніяк, а гэта першы выпадак рэгістрацыі птушкі-драпежніцы ў сталіцы. Пра гэтую навіну паведаміў нашай рэдакцыі дырэктар грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Аляксандр Вінчэўскі. Наш фотакарэспандэнт Анатоль Кляшчук выехаў у адзін з найстарэйшых раёнаў сталіцы — Грушаўку і знайшоў месца, дзе... драмала лясная госця.

— Мяне ўразіла сама птушка — хоць раней я і здымаў гэтую саву — і тое, колькі цікаўных з фотаапаратамі і смартфонамі сабралася там, — расказаў Анатоль Кляшчук. — Для многіх гэта была сенсацыя, бо ніколі ў жыцці яны не бачылі саву, а тым больш рэдкі від.

Дырэктар АПБ Аляксандр Вінчэўскі выказаў меркаванне, што арэал гнездавання гэтай птушкі знаходзіцца на поўначы Беларусі, магчыма, кугакаўка прыляцела ў пошуках ежы з Бярэзінскага біясфернага запаведніка.

**Ул. інф.**

■ Блізкі рэгіён

# ІНВЕСТЫЦЫІ, ЛАГІСТЫКА І... ЗА́МКІ

**Кіраўнік Гродзенскай вобласці — аб розніцы паміж усходам і захадам, паразуменні фермераў і буйных агракомплексаў, спосабах прыцягнення турыстаў і прыватнай ініцыятыве ў рэстаўрацыі будынкаў**

**Падчас асабістай размовы ў старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзіміра КРАЎЦОВА хацелася спытаць шмат пра што — і пра эканоміку, і пра адметнасці рэгіёна, і пра гісторыка-культурную спадчыну, і пра нешта асабістае, калі паспееца. А атрымалася так, што, адказваючы на пытанні, якія датычыліся развіцця вобласці, Уладзімір Васілевіч выказваў і свае ўласныя адносіны да таго, пра што гаварыў. А на асабістыя пытанні часу не хапіла. Тым не менш з гэтай нашай размовы чытачы, спадзяюся, убачаць не толькі надзённыя клопаты заходняй вобласці нашай краіны, яе непаўторнасць і перспектывы, але і чалавека, які гэтымі клопатамі жыве і які за гэты ўнікальны край і яго жыхароў адказвае...**

*— Уладзімір Васілевіч, да таго як Вы былі прызначаны кіраўніком Гродзенскай вобласці, Ваша жыццё і працоўная дзейнасць звязаныя з гэтым рэгіёнам ніяк не былі — увесь час Вы працавалі на Магілёўшчыне. Як Вам падалося на першым часе: розніца паміж заходнімі і ўсходнімі рэгіёнамі сапраўды існуе? У чым яна заключаецца і як хутка Вы да яе прыстасаваліся?*




Фота БЕЛТА.

— Сапраўды, захад і ўсход адрозніваюцца, і гэта датычыцца не толькі Гродзеншчыны, але і заходніх раёнаў увогуле. На тое былі аб'ектыўныя гістарычныя перадумовы. На працягу стагоддзяў тут на стыку цывілізацый і дзяржаўных межаў побач жылі беларусы, палякі, літоўцы, татары, яўрэі. Суседства культур, традыцый, абмен дасягненнямі і інавацыямі ўзбагачалі і давалі гарадзенцам незаменны вопыт, вучылі быць гнуткімі, развілі дзелавую актыўнасць. Напэўна, таму людзі тут больш прадпрымальныя, дысцыплінаваныя, адрозніваецца культура паводзін і побыту. Яшчэ ёсць адна, на мой погляд, вызначальная асаблівасць. На Гродзеншчыне больш людзей, якія называюць сябе вернікамі, — больш за 80 працэнтаў жыхароў, аб гэтым сведчаць сацыялагічныя апытанні. Я глыбока перакананы, што калі чалавек веруючы, то ён з большай адказнасцю ставіцца да жыцця, да працы, да месца, у якім жыве. У наш складаны час менавіта вера робіць чалавека ўпэўненым у сабе і ва ўласных сілах і здольнасцях.

Калі яшчэ гаварыць пра асаблівасці, то я вылучыў бы высокую культуру земляробства, якая гістарычна склалася ў Прынёманскім краі. Сельская гаспадарка — таксама наш своеасаблівы брэнд.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!

Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!